–"– игрового времени заканчэнне гульнёвага часу, канец часу гульні
ИСТЕЧЬ (о времени) мінуць, скончыцца
ИСХОД **м** (результат) вынік, -у **м**
–"– соревнований вынік спаборніцтваў
–"– игры вынік гульні
–"–, ничейный вынік, гульня ўнічыю

К

КАЛЕНДАРЬ **м** каляндар, -а **м**; расклад, -у **м**
–"– игр каляндар (расклад) гульняў
КАНДИДАТ **м** кандыдат, -а **м**
–"– в мастера спорта кандыдат у майстры спорту
–"– в сборную команду кандыдат у зборную каманду
КАНОИСТ **м** канаіст, -а **м**
КАНОЭ **нескл. ср** каноэ **нескл. ср**
КАНОЭ-ДВОЙКА **ж** каноэ-двойка, -і **ж**
КАНОЭ-ОДИНОЧКА **ж** каноэ-адзіночка, -і **ж**
КАПИТАН **м** капітан, -на **м**
–"– команды капітан каманды
КАРТОЧКА **ж** картачка, -і **ж** О показать –"– -у паказаць картку
–"–, жёлтая **футб.** жоўтая картка
–"–, зелёная **хокк. на траве** зялёная картка
–"–, красная **футб.** чырвоная картка
–"–, учётная спортсмена уліковая картка спартсмена

КАРУСЕЛЬ **ж** карусе́ль, -і **ж**
КАРЬЕР **м конн.** кар'ер, -у **м** О мчаться –"– ом бе́гчы (імча́цца) кар'е́рам
КАСАНИЕ **ср** дотык, -у **м**
–"– линии финиша до́тык да лініі фінішу
–"– льда руками до́тык да лёду рука́мі
–"–, неумышленное ненаўмы́сны до́тык
–"–, неправильное няпра́вільны до́тык
–"– поверхности стола до́тык да паве́рхні стала
–"– сетки игроком до́тык да се́ткі гульцо́м
–"– лопатками ковра **бор.** дакрана́нне лапа́ткамі да дывана́
КАСКАД **м** каска́д, -у **м**
–"– прыжков каска́д скачко́ў
–"– приёмов каскад прыёмаў
КАТАМАРАН **м** катамара́н, -а **м**
КАТАНИЕ **ср** коўзанне, -ння, **ср**; язда, -ы **ж**; катанне, -ння **ср**; бег, -у **м**
–"– на веласипеде язда́ на веласіпе́дзе
–"– на коньках ко́ўзанне (бег) на канька́х
–"– на лыжах бег на лы́жах
–"–, одиночное фиг. ко́ўзанне адзіно́чнае
–"–, парное ко́ўзанне па́рнае
–"– свободное во́льны бег (язда́, ката́нне)
КАТЕГОРИЯ **ж** катэго́рыя, -і **ж** О сменить весовую –"– -ю **ж** перамяні́ць вагаву́ю катэго́рыю
–"–, детская возрастная дзіця́чая ўзро́ставая катэго́рыя
–"–, судейская судзе́йская катэго́рыя
–"– трудности маршрута тур. катэго́рыя ця́жкасці маршру́ту
КАТОК **м**, като́к, -а **м**
–"–, высокогорный высакаго́рны като́к
–"– для массового катания като́к для ма́савага ко́ўзання (ката́ння)
–"–, искусственный шту́чны като́к
–"–, открытый адкры́ты като́к
КАЧАНИЕ **ср** гайда́нне, -ння **ср**; хіста́нне, -ння **ср**; маха́нне, -ння **ср**
КАЧАТЬСЯ **гимн.** гайда́цца, хіста́цца, разма́хвацца

КВАЛИФИКАЦИОННЫЙ кваліфікацыйны
КЕДЫ **мн** кеды, -аў **мн**
КИСТЬ **ж** кісць, -і **ж**
–"– руки кісць рукі
КЛАССИФИКАЦИЯ **ж** класіфікацыя, -і **ж**
–"–, возрастная узроставая класіфікацыя
–"– участников соревнований класіфікацыя ўдзельнікаў спаборніцтваў
КЛИНОК **м** клінок, -нка **м**
КЛУБ **м** клуб, -а **м** О перейти в другой –"– перайсці ў іншы клуб
–"–, любительский аматарскі клуб, клуб аматараў
–"–, спортивный спартыўны клуб, спартклуб
КЛЮШКА **ж** клюшка, -і **ж** О владеть –"– -ой валодаць клюшкай; поднять –"– -у выше плеч узняць клюшку вышэй плеч
вышэй плячэй
КОВЁР **м** дыван, -а **м** О выйти на –"– выйсці на дыван; коснуться лопатками ковра дакрануцца лапаткамі да дывана
–"–, борцовский барцоўскі дыван
КОЗЁЛ **гимн., м** казёл, -зла **м**
КОЛЕБАНИЕ **ср** хістанне, -ння **ср**
КОЛЕСО **ср** кола, -а **ср** О обогнать на –"– абагнаць на кола
КОЛИЧЕСТВО **ср** колькасць, -і **ж**
–"– забитых мячей колькасць забітых мячоў
–"– набранных баллов колькасць набраных балаў
–"– потерянных очков колькасць загубленых (страчаных) ачкоў
КОЛЛЕГИЯ **ж** калегія, -і **ж**
–"–, главная судейская галоўная судзейская калегія
КОЛОННА **ж** калона, -ы **ж**
–"– по два калона па двое
–"–, разомкнутая разамкнёная калона
КОЛЧАН **м** калчан, -а **м**
КОЛЬЦА **гимн., мн** кольцы, -аў **мн**
КОМАНДА **ж** каманда, -ы **ж**
–"–, владеющая мячом каманда, якая валодае мячом
–"–, возглавляющая турнирную таблицу каманда, якая ўзначальвае турнірную табліцу
–"–, мирового класса каманда сусветнага ўзроўню (класу)

КОМАНДА-НАРУШИТЕЛЬ **м** каманда-парушальніца, -ы **ж**
КОМАНДА-ПОБЕДИТЕЛЬНИЦА **м** каманда-пераможца, -ы **ж**
КОМБИНАЦИЯ **ж** камбінацыя, -і **ж** О завершить –"– -ю завяршыць камбінацыю; прервать –"– -ю перапыніць камбінацыю
–"–, молниеносная маланкавая (бліскавічная) камбінацыя, вокамгненная камбінацыя
–"–, наигранная нагуляная камбінацыя
КОМИТЕТ **м** камітэт, -а **м**
–"–, Национальный Олимпийский Нацыянальны Алімпійскі Камітэт (НАК)
–"–, организационный арганізацыйны камітэт
–"–, подготовительный падрыхтоўчы камітэт
КОММЕНТАРИЙ **м** каментарый, -рыя **м**
КОММЕНТАТОР **м** каментатар, -а **м**
КОМПЛЕКС **м** комплекс, -у **м**
–"– упражнений утренней гимнастики комплекс практыкаванняў для ранішняй гімнастыкі
КОНЁК **м** канёк, канька **м**
–"–, опорный апорны канёк
–"–, скользящий коўзкі канёк
–"–, толчковый штуршковы канёк
КОНЬКИ **мн** канькі, -оў **мн** О кататца на –"– ах бегаць на коньках
–"–, беговые бегавыя канькі
КОНЬКОБЕЖЕЦ **м** канькабежац, -жца **м**
КООРДИНАЦИЯ **ж** каардынацыя, -цыі **ж**
КОПЬЁ **ср** кап'ё, -я **ср**
–"–, деревянное драўлянае кап'ё
–"–, планирующее планіруючае кап'ё
КОПЬЕМЕТАТЕЛЬ **м** кап'якідальнік, -а **м**
КРАЙНИЙ (о нападающем) крайні
КРЕПЛЕНИЕ **ср** мацаванне, -ння **ср**
–"– для лыж мацаванне для лыжаў
КРЕСТ **м** крыж, крыжа **м**
–"– в стойке на руках крыж у стойцы на руках
КРОВОСНАБЖЕНИЕ **ср** кровазабяспечанне, -ння **ср**
КРОВОТЕЧЕНИЕ **ср** крывацёк, -у **м**

КРОЛИСТ **плав.** краліст, -а **м**
КРОЛЬ **м** кроль, -ю **м**
КРОМКА **ж** (игрового поля) край, -ю **м**
КРОСС **м** крос, -у **м**
–"–, легкоатлетический лёгкаатлетычны крос
КРОССМЕН **м** красмен, -а **м**
КРОССОВКИ **мн** красоўкі, -овак **мн**
КРУГ **м** кола, -а **ср** О выйти из –"– -а выйсці з кола
–"– для метания диска круг для кідання дыска
–"– почёта кола гонару
–"– претендентов кола прэтэндэнтаў
–"–, спасательный выратавальнае кола
КУБКОВЫЙ кубкавы; –"– -ая встреча кубкавая сустрэча
КУБОК **м** кубак, -бка **м**
–"– Дэвиса Кубак Дэвіса
–"– европейских чемпионов Кубак еўрапейскіх чэмпіёнаў
–"–, межконтинентальный міжкантынентальны кубак
–"– обладателей кубков Кубак уладальнікаў кубкаў
–"–, переходящий пераходны кубак
–"–, почетный ганаровы кубак
–"– УЕФА Кубак УЕФА
КУВЫРОК **гимн. м** кулёк, -лька **м**
–"– вперёд согнувшись кулёк наперад сагнуўшыся
–"– назад через голову кулёк назад праз галаву
КУЛЬТУРЫЗМ **м** культурызм, -у **м**
КУЛЬТУРЫСТ **м** культурыст, -а **м**
КУПАЛЬНИК **м** купальнік, -а **м**
КУПАНИЕ **ср** купанне, -ння **ср**
КУРБЕТ **гимн. м** курбет, -а **м**
КУРОК **м** курок, -рка **м** О взвести курок узвесці курок
КУЧНОСТЬ стрел., **ж** кучнасць, -і **ж**; шчыльнасць, -і **ж**
КУЧНЫЙ кучны, шчыльны
–"– попадание в мишень кучнае пападанне ў мішэнь

Л

ЛАВРЫ **мн** лаўры, -аў **мн**
–"– победителя лаўры пераможцы
ЛАДЕЙНЫЙ **шахм.** ладзейны
–"– эндшпиль ладзейны эндшпіль

ЛАДЬЯ **ж** ладдзя, -і **ж**; **разг.** тура, -ы **ж**
ЛАСТОЧКА **гимн., фиг. ж** ластаўка, -і **ж**
–"– ауэрбах **плав.** ластаўка аўэрбах
ЛАСТЫ **мн** ласты, -аў **мн**; плаўні, -яў **мн**
ЛЕГКОАТЛЕТ **м** лёгкаатлет, -а **м**
ЛЕГКОАТЛЕТИЧЕСКИЙ лёгкаатлетычны
ЛЕГКОВЕС **м** лёгкавагавік, -а **м**
ЛЕЗВИЕ **ср** лязо, -а **ср**
–"– клинка лязо клінка
ЛЕНТОЧКА **ж** стужка, -і **ж**
–"–, финишная фінішная стужка
ЛЕСЕНКА **лыжи, ж** лесвічка, -і **ж** О восхождение –"– -ой узыходжванне лесвічкай
ЛЕСТНИЦА **ж** лесвіца, -ы **ж**
–"–, гимнастическая гімнастычная лесвіца
ЛИГА **ж** ліга, -ы **ж**
–"–, высшая вышэйшая ліга
ЛИДЕР **м** лідэр, -а **м** О выйти в –"– -ы выйсці ў лідэры
–"–, единоличный адзінаасобны лідэр
ЛИДЕРСТВО **ср** лідэрства, -а **ср** О борьба за –"– о в турнире барацьба за лідэрства ў турніры
ЛИДИРОВАНИЕ **ср** лідзіраванне, -ння **ср**
ЛИДИРОВАТЬ лідзіраваць
ЛИНИЯ **ж** лінія, -і **ж**
–"–, боковая бакавая лінія
–"–, осевая восевая лінія
ЛИЧНЫЙ асабісты
–"– зачёт асабісты залік
ЛОВКОСТЬ **ж** спрыт, -у **м**
ЛОВУШКА **ж** пастка, -і **ж**
ЛОПАСТЬ **ж** лопасць, -і **ж**
ЛОПАТКА **ж анат.** лапатка, -і **ж** О дожать на –"– і дацiснуць на лапаткі; положить на обе –"– и пакласці на абедзве лапаткі.
ЛУК **м** лук, лука **м**
ЛУТЦ **фиг. м** лутц, -а **м**
–"– в полоборота лутц на паўабарота
–"–, тройной трайны лутц
ЛЫЖЕРОЛЛЕРЫ **мн** лыжаролеры, -аў **мн**

ЛЫЖИ **мн** лыжы, -аў
ЛЫЖНИК **м** лыжнік, -а **м**
–"–, летающий лятаючы лыжнік
ЛЫЖНИК-ПРЫГУН **м** лыжнік-скакун, -а **м**
ЛЫЖНЯ **ж** лыжня, -і **ж** О проложить –"– -ю праклаcці лыжню; уступіць –"– -ю даць лыжню, сатупіць з лыжні
ЛЮБИТЕЛЬ **м** аматар, -а **м**
ЛЮБИТЕЛЬСКИЙ аматарскі
ЛЯМКА **ж** шлейка, -і **ж**
–"– купальника шлейка купальніка

М

МАЗЬ **ж** мазь, -і **ж**
МАЙКА **ж** майка, -і **ж**
МАЛОКАЛИБЕРНЫЙ малакаліберны, дробнакаліберны
МАНЕЖ **м** манеж, -а **м**; навес, -а **м**
–"– для выездки манеж для верховой язды
–"–, крытый манеж (навес) крыты
МАНЕРА **ж** манера, -ы **ж**; паводзіны, -дзін **мн**
–"–, грубая грубыя паводзіны
–"–, корректная карэктныя паводзіны
МАРАФОН **м** марафон, -у **м**
МАРАФОНЕЦ **м** марафонец, -нца **м**
МАРАФОНСКИЙ марафонскі
МАСКА **ж** маска, -і **ж**
МАССАЖ **м** масаж, -у **м**
–"–, лечебный лячэбны масаж, лекавы масаж
–"–, общий агульны масаж
–"–, предварительный папярэдні масаж
МАССАЖИСТ **м** масажыст, -а **м**
МАССОВОСТЬ **ж** масавасць, -і **ж**
МАССОВЫЙ масавы
–"– спорт масавы спорт
МАСТЕР **м** майстар, -тра **м**
–"– спорта майстар спорту
МАСТЕРСТВО **ср** майстэрства, -а **ср**
–"–, тактическое тактычнае майстэрства
МАТ[1] **шахм. м** мат, мата **м** О объявить –"– королю аб'явіць мат каралю

МАТ² м мáта, -ы
–"–, гимнастический гімнастычная мáта
–"– для приземления (при прыжках) мáта для прызямлéння
МАТРАЦ м матрáц, -а м
МАТЧ м матч, -а м
МАТЧ-РЕВАНШ м матч-рэвáнш, -у м
МАТЧ-ТУРНИР м матч-турнíр, -у м
МАХ м мах, -у м
–"–, большой вялíкі мах
–"– двумя рукамі мах дзвюмá рукáмі
–"–, одновременный адначасóвы мах
–"–, поперечный папярэ́чны мах
–"– туловищем вперёд мах тýлавам упéрад
МЕДАЛИСТ м медалíст, -а м
–"–, бронзовый брóнзавы медаліст
–"–, золотой залаты́ медаліст
–"–, серебряный сярэ́браны медалíст
МЕДАЛЬ ж медáль, -я м завоевать –"– заваявáць медáль
–"–, памятная олимпийская пáмятны алімпійскі медáль
МЕЖСЕЗОНЬЕ ср міжсезóнне, -ння ср
МЕМОРИАЛ м мемарыя́л, -а м
–"– братьев Знаменских Мемарыя́л братóў Знáменскіх
МЕНЬШИНСТВО ср мéншасць, -і ж
–"–, численное лíкавая мéншасць О остаться в численном –"– -е застáцца ў лíкавай мéншасці
МЕСТО ср мéсца, -а ср О занять первое –"– заня́ць пéршае мéсца; поделить первое место раздзяліць першае месца
МЕТАНИЕ ср кідáнне, -ння ср
–"– копья кідáнне кап'я
МЕТАТЕЛЬ м кідáльнік, -а м
–"– диска дыскабóл, -а м
МЕТАТЕЛЬНИЦА ж кідáльніца, -ы ж
МЕТКИЙ трáпны
–"– выстрел трáпны вы́страл
МЕТКОСТЬ ж трáпнасць, -і ж
МИКРОЦИКЛ м мікрацы́кл, -а м
–"–, восстановительный аднаўлéнчы мікрацы́кл
–"–, разгрузочный разгрýзачны мікрацы́кл

МИНИ-ВОЛЕЙБОЛ м міні-валейбол, -а м
МИНИ-ГАНДБОЛ м міні-гандбол, -а м
МИНИ-ФУТБОЛ м міні-футбол, -а м
МИНУТА ж хвіліна, -ы ж удалить на две –"– -ы выдаліць на дзве хвіліны
МИШЕНЬ ж мішэнь, -і ж О поразить –"– трапіць (пацэліць) у мішэнь
–"–, движущаяся рухомая мішэнь
–"– для стрельбы па... мішэнь для стральбы па...
–"– для скоростной стрельбы мішэнь для хуткаснай стральбы
МНОГОБОРЕЦ м мнагаборац, -рца м
МНОГОБОРКА ж мнагаборка, -і ж
МНОГОБОРЬЕ ср шматбор'е, -я ср; мнагаборства, -а ср
–"–, атлетическое атлетычнае шматбор'е (мнагаборства)
–"–, классическое класічнае шматбор'е (мнагаборства)
МОЛОТ м молат, -а м О метать –"– кідаць молат
МОМЕНТ м момант, -у м О создать голевой –"– стварыць галявы момант ликвидировать опасный –"– ліквідаваць небяспечны момант
МОСТ м мост, -а м О встать на –"– стаць на мост
МОСТИК м гимн. мосцік, -а м
МОТОПРОБЕГ м мотапрабег, -у м
МОЩЬ ж магутнасць, -і ж; моц, моцы ж; сіла, -ы ж
МУСКУЛ м мускул, -а м
МУСКУЛАТУРА ж мускулатура, -ы ж
МУСКУЛИСТЫЙ мускулісты
МУСКУЛЬНЫЙ мускульны
МУШКА ж (оружия) мушка, -і ж О взять на –"– -у узяць на мушку
–"–, крестообразная крыжападобная мушка
–"–, передвижная рухомая мушка
МЫШЦА ж мышца, -ы ж
–"–, двуглавая двухгаловая мышца
–"–, дельтовидная дэльтападобная мышца
МЯЧ м мяч, -а м О ввести –"– в игру увесці мяч у гульню; завладеть –"– -ом авалодаць мячом; перакінуць –"– через блок перакінуць мяч цераз блок; перавести –"– на сторону соперника перавесці мяч на палавіну саперніка; установить –"– паставіць мяч

МЯЧ, кручённый кручаны мяч
–"–, навесной навесны мяч
–"–, неотразимый неадхільны мяч
–"–, спорный спрэчны мяч

Н

НАВЫК **м** навык, -у **м**; звычка, -і **ж**
–"–, координационный каардынацыйны навык
–"–, специальный спецыяльный навык
НАГРАДА **ж** узнагарода, -ы **ж**
–"–, почётная ганаровая ўзнагарода
НАГРАЖДЕНИЕ **ср** узнагароджванне, -ння **ср**
НАГРУДНИК **м** (амуниция) нагруднік, -а **м**
НАГРУЗКА **ж** нагрузка, -і **ж** О дать –"– -у даць нагрузку; повысить –"– -у павялічыць нагрузку
–"–, длительная працяглая нагрузка
–"–, интенсивная інтэнсіўная нагрузка
–"–, непрерывная бесперапынная нагрузка
–"–, предельная гранічная нагрузка
–"–, умеренная памяркоўная нагрузка
НАЖИМ **м** націск, -у **м**; націсканне, -ння **ср**
НАИГРЫВАНИЕ **ср** найграванне, -ння **ср**; нагульванне, -ння **ср**
–"– звеньев найграванне (нагульванне) звенняў
–"– комбинации найграванне (нагульванне) камбінацыі
НАКАЗАНИЕ **ср** пакаранне, -ння **ср**; спагнанне, -ння **ср**; штраф, -у **м** О заработать–"– зарабіць спагнанне (штраф); отбывать наказание адбываць пакаранне (штраф)
–"–, персональное персанальнае (асабістае) пакаранне (спагнанне, штраф)
–"– штрафным броском пакаранне штрафным кідком
НАКАТ **м** накат, -у **м**
–"– захватом шеи накат захопам шыі
–"– на ворота атака на вароты (брамку)

НАКЛАДКА **ж** гимн., тенн. накладка, -і **ж**
–"–, гимнастическая гімнастычная накладка
–"– на предплечье, защитная асцерагальная накладка на перадплечча

НАКЛОН **м** нахіл, -у **м**
НАКЛОНИТЬСЯ нахіліцца, нагнуцца
НАКОЛЕННИЕ **м** накаленнік, -а **м**
НАКОНЕЧНИК **м** наканечнік, -а **м**; вастрыё, -я **ср**
–"– копья вастрыё кап'я
–"– лыжной палки наканечнік лыжнай палкі
НАКРЫВАНИЕ **ср бор.** накрыванне, -я **ср**
НАЛОКОТНИК **м** налакотнік, -а **м**
НАПАДАЮЩИЙ **м** нападнік, -а **м**; нападаючы, -ага **м**
–"–, играющий на острие атаки нападнік (нападаючы), які гуляе на вастрыі атакі
–"–, выдвинутый вперёд вылучаны (выстаўлены) наперад нападнік (нападаючы)
НАПАДЕНИЕ **ср** нападзенне -ння **ср**; атака, -і **ж**;
–"– в рамках правил нападзенне ў межах правілаў
–"– на вратаря нападзенне на варатара
–"–, позиционное пазіцыйная атака
НАПЕРЕГОНКИ навыперадкі, наўзахваткі
НАПЛЕЧНИК, -а **м**
НАПОР **м** напор, -у **м**; націск, -у **м**
НАПОРИСТОСТЬ **ж** настойлівасць, -ці **ж**
НАПРАВЛЕНИЕ **ср** кірунак, -нку **м**;напрамак, -мку **м**
НАПРЯЖЕНИЕ **ср** напружанне, -ння **ср**; напружанасць, -і **ж**
–"– воли напружанне волі
–"–, стартовое стартавая напружанасць
НАПРЯЧЬ напружыць, напнуць, напяць
НАРАЩИВАНИЕ **ср** павелічэнне, -ння **ср**; павышэнне, -ння **ср**; нарошчванне, -ння **ср**
–"– скорости павелічэнне хуткасці
–"– спортивной формы павышэнне спартыўнай формы
–"– мускулов нарошчванне мускулаў
НАРУШЭННЕ **ср** парушэнне, -ння **ср**
–"–, грубое грубае парушэнне
–"–, неумышленное ненаўмыснае парушэнне
НАРУШИТЕЛЬ **м** парушальнік, - **м** О предупредить –"– -я папярэдзіць парушальніка; удалить –"– -я с поля выдаліць парушальніка з поля (пляцоўкі)

НАРУШИТЬ пару́шыць
НАСЕДАТЬ (на противника) насяда́ць, атакава́ць
НАСКОК м наско́к, -у м О -с –"– -а з наско́ку
–"– толчком наско́к штуршко́м
–"– с разбега наско́к з разго́ну (разбе́гу)
НАСТАВНИК м наста́ўнік, -а м; трэ́нер, -а м
НАСТИЛ м насці́л, -у м; памо́ст, -у м
НАСТРОЕНИЕ ср настро́й, -ю м
НАСТРОЕНИЕ ср на́ступ, -у м
–"–, решительное рашу́чы на́ступ
НЕДЕЛЯ ж ты́дзень, -я м
–"–, олимпийская алімпі́йскі ты́дзень
–"–, предолимпийская перадалімпі́йскі ты́дзень
НЕПРЕРЫВНОСТЬ ж бесперапы́ннасць, -і ж
НЕРВОЗНОСТЬ ж нерво́васць, -і ж
–"–, предстартовая перадста́ртавая нерво́васць
НЕСОБЛЮДЕНИЕ ср невыкана́нне, -ння ср; паруша́нне, -ння
–"– правил пару́шэнне пра́вілаў
–"– правила трёх секунд баск. невыкана́нне пра́віла трох секу́ндаў
НЕСПОСОБНОСТЬ ж нязд́ольнасць, -і ж; нязда́тнасць, -і ж
–"– продолжать бой нязд́ольнасць праця́гваць бой
НЕЯВКА ж нез'яўле́нне, -ння ср; няя́ўка, -і ж
–"– на игру нез'яўле́нне (няя́ўка) на гульню́
НИЧЬЯ ж нічыя́, -ёй ж О довольствоваться –"– ёй задаво́ліцца нічые́й; свести к –"– -ей закончыць унічы́ю
–"–, бесцветная бля́клая нічыя́
–"–, боевая баява́я нічыя
–"–, нулевая нуля́вая нічыя
НОКАУТ м нака́ўт, -а м послать в –"– адпра́віць у нака́ўт
–"–, молниеносный вокамгне́нны нака́ўт
–"– ударом в голову нака́ўт уда́рам у галаву́
НОКАУТИРОВАТЬ накаўтава́ць
НОКДАУН м накда́ўн, -а м
НОМЕР м ну́мар, -а м
НОРМА ж но́рма, -ы ж
–"–, гроссмейстерская гросма́йстарская но́рма
–"–, квалификационная кваліфікацы́йная но́рма

НОРМАТИВ **м** нарматыў, -ыву **м** О выполнить –"– выканаць нарматыў; превысить –"– пераўзысці нарматыў
–"– мастера спорта нарматыў майстра спорту
–"–, разрядный разрадны нарматыў
НЫРОК **м** бокс нырэц, -рца **м**

О

ОБВЕСТИ абыграць, абвесці
ОБВОДКА **ж** абводка, -і **ж**; абвядзенне, -ння **ср**
ОБГОН **м** абгон, -у **м**
ОБДУМЫВАНИЕ **ср** абдумванне, -ння **ср**
–"– хода **шахм., шашк.** абдумванне хода
ОБЗОР **м** агляд, -у **м**
ОБЛАДАТЕЛЬ **м** уладальнік, -а **м**
–"– кубка уладальнік кубка
–"– чемпионского звания уладальнік чэмпіёнскага звання (тытула)
ОБМУНДИРОВАНИЕ **ср** адзенне, -ння **ср**; экіпіроўка, -і **ж**
ОБОД **м** вобад, -а **м**
ОБОЗРЕВАТЕЛЬ **м** аглядальнік, -а **м**
–"–, спортивный спартыўны аглядальнік
ОБОЗРЕНИЕ **ср** агляд, -у **м**
–"–, футбольны агляд
–"–, шахматное шахматны агляд
ОБОЙМА **ж** абойма, -ы **ж**
ОБОРОНА **ж** абарона, -ы **ж** О держать –"– у абараняцца; оголить –"– -у агаліць абарону
–"–, активная актыўная абарона
–"–, гибкая рухомая (гнуткая) абарона
–"–, зонная абарона зонная
–"–, надежная надзейная абарона
–"–, насыщенная насычаная абарона
–"–, непреодолимая неперадольная абарона
ОБОРОНЯТЬСЯ абараняцца
ОБОРУДОВАНИЕ **ср** абсталяванне, -ння **ср**;
ОБОСТРЕНИЕ **ср** абвастрэнне, -ння **ср**
–"– игры абвастрэнне гульні
–"– позиции абвастрэнне пазіцыі
ОБРАБОТКА **ж** апрацоўка, -і **ж**

ОБРАБОТКА мяча апрацоўка мяча
ОВРУЧ **м** абруч, -а **м** О бросить –”– кінуць абруч
ОБУВЬ **ж** абутак, -тку **м**
–”–, беговая бегавы абутак
–”–, кроссовая кросавы абутак
–”–, спортивная спартыўны абутак
ОБХВАТ **м** абхват, -у **м**; аб’ём, -у **м**
–”– бедра аб’ём бядра
–”– ног соперника **бор** абхват ног саперніка
ОБХОД **м** абгон, -у **м**
–”– на круг абгон на круг
–”– на скорости абгон на хуткасці
–”– по числу попыток абгон па колькасці спроб
ОБЩЕРАЗВИВАЮЩИЙ для агульнага развіцця; –”– -ие упражнения практыкаванні для агульнага развіцця
ОБЩЕСТВО **ср** таварыства, -а **ср**
–”– добровольное спортивное дабраахвотнае спартыўнае таварыства
ОБЫГРАТЬ абыграць, перагуляць; выйграць
ОДИН: выйти –”– на один выйсці сам на сам
ОДИННАДЦАТИМЕТРОВЫЙ **м** адзінаццаціметровы, -ага **м**; пенальці **ср. нескл.**
ОДНОКЛУБНИК **м** аднаклубнік, -а **м**
ОКОНЧАНИЕ**ср** заканчэнне, -ння **ср**; канец, -ца **м**
–”– игры заканчэнне (канец) гульні
–”– тайма заканчэнне (канец) тайма
ОЛИМПИАДА **ж** алімпіяда, -ы **ж**
ОЛИМПИЕЦ **м** алімпіец, -і йца **ж**
ОЛИМПИЙСКИЙ алімпійскі
ОПЕРЕДИТЬ (по времени) апярэдзіць, выперадзіць
ОПРЕДЕЛЕНИЕ (установление) ср выяўленне, -ння **ср**; вызначэнне, -ння **ср**; устанаўленне, -ння **ср**
–”– возраста вызначэнне ўзросту
–”– победителя выяўленне пераможцы
–”– сроков соревнований вызначэнне тэрмінаў спаборніцтва
ОПРОБОВАНИЕ **ср** апрабаванне, -ння **ср**; выпрабаванне, -ння **ср**
ОПРОТЕСТОВАТЬ апратэставаць; заявіць пратэст; не пагадзіцца (з кім, чым)

ОРГАНИЗАТОР **м** арганізатар, -а **м**
–"– спорта арганізатар спорту
–"– чемпионата арганізатар чэмпіянату
ОРГАНИЗАЦИЯ **ж** арганізацыя, -і **ж**
ОРГАНИЗМ **м** арганізм, -а **м** О закаливать –"– загартоўваць арганізм
ОРИЕНТИРОВАНИЕ **ср** арыентаванне, -ння **ср**
ОРУЖИЕ **ср** зброя, -і **ж** О зарядить –"– зарадзіць зброю
–"–, автоматическое аўтаматычная зброя
–"–, колющее колючая зброя
–"–, огнестрельное агнястрэльная зброя
–"–, пневматическое пнеўматычная зброя
ОСАДА **ж** аблога, -і **ж**; асада, -ы **ж**
ОСЕЧКА **ж** асечка, -і **ж**
–"– стартового пистолета асечка стартавага пісталета
ОСКОРБЛЕНИЕ **ср** абраза, -ы **ж**; знявага, -і **ж** нанести –"– -е абразіць, зняважыць
–"– соперника абраза (занявага) саперніка
ОСПАРИВАНИЕ **ср** аспрэчванне, -ння **ср**
–"– решения судьи аспрэчванне выроку (рашэння) суддзі
ОСТАНОВКА **ж** спыненне, -ння **ср**; затрымка, -і **ж**
–"– боя ввиду явного преимущества **бокс** спыненне бою з-за відавочнай перамогі
–"– мяча, умышленная наўмысная затрымка мяча
ОСТРИЁ **ср** вастрыё, -я **ср**; наканечнік, -а **м**; лязо, -а **ср** играть на –"– -е атаки гуляць на вастрыі атакі
–"– конька лязо канька
ОТБИВ **м** адбіў, -біву **м**
ОТБОР **м** адбор, -ру **м**
ОТБРАСЫВАНИЕ **ср** адкідванне, -ння **ср**
–"– мяча за боковую линию адкідванне мяча за бакавую лінію
ОТБЫВАНИЕ **ср** адбыванне, -ння **ср**
–"– наказания адбыванне пакарання
ОТДЫХ **м** адпачынак, -у **м**
–"–, активный актыўны адпачынак
ОТКАЗ **м** адмаўленне, -ння **ср**; адмова, -ы **ж**
–"– подчиниться требованию судьи адмаўленне ад падпарадкавання патрабаванню суддзі
–"– от продолжения схватки адмова ад працягу паядынка (барацьбы)

ОТКАЗ от участия (в соревновании) адмова ад удзелу (у спаборніцтвах)
ОТКИДКА **ж** адкідка, -і **ж**
ОТКЛОНЕНИЕ **ср** адхіленне, -ння **ср**
ОТКРЫТИЕ **ср** адкрыццё, -я **ср**
–"– ОЛИМПИЙСКИХ Игр адкрыццё Алімпійскіх Гульняў
–"–, торжественное урачыстае адкрыццё
ОТКРЫТЬСЯ 1. (начаться) пачацца; 2. (освободиться от опеки) вызваліцца, адкрыцца
ОТМАШКА **ж** адмашка, -і **ж** О дать –"– -у рукой (флажком) зрабіць адмашку рукой (сцяжком)
ОТРАБОТКА **ж** (тренировка) выпрацоўка, -і **ж**; трэніроўка, -і **ж**
–"– техники выпрацоўка тэхнікі
ОТРАЖЕНИЕ **ср** адбіццё, -я **ср**
ОТРЫВ **м** (в гонке) 1. адрыў, -рыву **м**; 2. (преимущество) перавага, -і **ж** О лидировать с –"– -ом лідзіраваць з перавагай (у што); увеличить –"– павялічыць адрыў
ОТСКОК **м** адскок, -у **м**
ОТСТАИВАНИЕ **ср** адстойванне, -ння **ср**
ОТСЧЁТ **м** адлік, -у **м**
ОТСЧИТЫВАТЬ адлічваць
ОТТАЛКИВАНИЕ **ср** адштурхванне, -ння **ср**; штуршок, -шка **м**
ОТЫГРЫШ **м** адыгрыванне, -ння **ср**
ОФСАЙД **м** афсайд, -у **м**; становішча па-за гульнёй
–"–, искусственный штучны афсайд
ОЧКО **ср** ачко, -а **ср** О бороться за каждое –"– змагацца за кожнае ачко; потерять –"– згубіць ачко
–"–, премиальное прэміяльнае ачко
–"–, штрафное штрафное ачко
ОШИБКА **ж** памылка, -і **ж**
–"– в исполнении памылка пры выкананні
–"– при приеме подачи памылка пры прыёме падачы
–"–, судейская судзейская памылка
–"–, тактическая тактычная памылка
ОШТРАФОВАТЬ аштрафаваць, пакараць
ОЩУЩЕНИЕ **ср** адчуванне, -ння **ср**
–"–, болевое болевае адчуванне

ПАДЕНИЕ **ср** падзéнне, -ння **ср**

ПАЛКА **ж в разн. знач.** пáлка, -і **ж**

ПАЛОЧКА **ж** пáлачка, -і **ж**

–"–, эстафетная эстафéтная пáлачка

ПАРА **ж** пáра: -ы **ж**

–"–, смешанная змéшаная пáра

–"–, стартующая последней пара, якая стартуе апóшняй

ПАРИРОВАНИЕ **ср** адбівáнне, -ння, **ср**; парыравáнне, -ння **ср**

ПАРИРОВАТЬ адбíць, парырáваць

ПАРТЕР **м бор.** партэ́р, -а **м** О перевести соперника в –"– перавéсці сапéрніка ў партэ́р

ПАРТИЯ **ж** пáртыя, -і **ж** О сыграть –"– -ю в шахматы згуля́ць пáртыю ў шáхматы; сдать –"– -ю без доигрывния прайгрáць пáртыю без дагýльвання

–"–, отложенная адклáдзеная партыя

–"–, прерванная перапы́неная партыя

ПАРТНЁР **м** партнёр -а **м**

ПАРУС **м** вéтразь, -я **м** О идти под –"– -ами ісці пад вéтразямі

ПАС **м** пас, -а **м**

–"– в óдно касание пас ў адзін дóтык

–"–, выверенный вы́вераны пас

–"–, неточный недаклáдны пас

–"–, скрытый скры́тны пас

ПАСОВАТЬ пасавáць, аддавáць пас

ПАТ **м** пат, -а **м**

ПЕНАЛЬТИ **ср нескл.** пенáльці **нескл., ср** О взять –"– адбіць пенальці не реализовать –"– не рэалізаваць пенáльці

ПЕНАЛЬТИСТ **м** пенальты́ст, -а **м**

ПЕРВЕНСТВО **ср** першынствó, -ва **ср** О бороться за –"– змагáцца за першынствó; разыграть –"– разыгрáць першынствó

ПЕРЕАДРЕСОВАТЬ пераадрасавáць

ПЕРЕАДРЕСОВКА **ж** пераадрасóўка, -і **ж**

ПЕРЕБОЙ **м фехт.** перабóй, -ю **м** О участвовать в –"– -е удзéльнічаць у перабóі

ПЕРЕБРАНКА **ж** (на площадке) свáрка, -і **ж**; лáянка, -і **ж**

ПЕРЕБРАСЫВАНИЕ **ср** перакідванне, -ння **ср**
ПЕРЕВЕС **м** (преимущество) перавага, -і **ж** О создать численный –"– стварыць колькасную перавагу
–"–, позиционный **шахм.** пазіцыйная перавага
–"– по количеству бросков перавага па колькасці кідкоў
ПЕРЕВОРОТ **м гимн.** пераварот, -у **м**
–"– согнувшись вперед пераварот сагнуўшыся наперад
ПЕРЕДАЧА **ж** перадача, -ы **ж**; пас, -а **м** О запоздать с –"– -ей мяча спазніцца з перадачай мяча; сделать –"– -у зрабіць перадачу
ПЕРЕДВИЖЕНИЕ **ср** перамяшчэнне, -ння **ср**
ПЕРЕИГРАТЬ перагуляць
ПЕРЕИГРОВКА **ж** перагульванне, -ння **ср**
ПЕРЕКЛАДИНА **ж** папярочка, -і **ж**; турнік, -а **м**; перакладзіна, -ы **ж**
ПЕРЕЛЁТ **м гимн.** пералёт, -у **м**
–"– Воронина пералёт Вароніна
–"– вперёд ноги врозь пералёт уперад ногі паасобна
–"– махом вперед пералёт махам наперад
–"– Ткачёва пералёт Ткачова
ПЕРЕЛОМ **м (в разн. знач.)** пералом, -у **м** О внести –"– в игру ўнесці пералом у гульню
–"– ноги пералом нагі
ПЕРЕМАХ **м** перамах, -у **м**; перамахванне, -ння **ср**
–"– прогнувшись с поворотом в упор перамах прагнуўшыся з паваротам ва ўпор
ПЕРЕНОС **м** перанос, -у **м**; перанясенне, -ння **ср**
ПЕРЕПЛЕТЕНИЕ **ср** перапляценне, -ння **ср**
ПЕРЕПЛЫВ **м** пераплыванне, -ння **ср**
–"– за участие в финале пераплыванне за ўдзел у фінале
ПЕРЕПОЛЗАНИЕ **ср** перапаўзанне, -ння **ср**
–"– на четвереньках перапаўзанне на карачках; рачкаванне, -ння **ср**
–"– по-пластунскі перапаўзанне па-пластунску
ПЕРЕРЫВ **м** перапынак, -нку **м** О уйти на –"– пайсці на перапынак
–"– между таймами перапынак паміж таймамі
–"–, минутный перапынак на адну хвіліну

ПЕРЕСТРОЕНИЕ **ср** перабудова, -ы **ж**
–"– колонны перабудова калоны
ПЕРЕХВАТ **м** перахоп, -у **м**; перахват, -у **м**
–"–, одновременный **гимн.** адначасовы перахват
ПЕРЕХОД **м** пераход, -у **м**
–"– в другой клуб пераход у іншы клуб
–"– в следующий круг пераход у наступны круг (наступнае кола)
ПЕРЕХОДЯЩИЙ: переходящий Кубок пераходны Кубак
ПЕРИОД **м** перыяд, -у **м**
–"–, заключительный заключны (апошні) перыяд
–"–, подготовительный падрыхтоўчы перыяд
ПЕРЧАТКА **ж** пальчатка, -і **ж**
ПЕТЛЯ **ж** пятля, -і **ж**
–"–, воздушная **фиг.** паветраная пятля
–"– Корбут пятля Корбут
ПЕШКА **ж** пешка, -і **ж**
–"–, изолированная ізаляваная пешка
–"– проходная прахадная пешка
ПИТАНИЕ **ср** 1. харчаванне, – -ння **ср**; кармленне, -ння **ср** 2. сілкаванне, -ння **ср**
–"–, белковое бялковае харчаванне
–"–, дополнительное дадатковае кармленне
–"– на дистанции сілкаванне на дыстанцыі
ПЛАВАНИЕ **ср** плаванне, -ння **ср**
–"– брассом плаванне брасам
–"– вольным стилем плаванне адвольным стылем
–"– сажёнкамі плаванне на сажонкі
ПЛАВАТЕЛЬНЫЙ плавальны
ПЛАВКИ **мн** плаўкі, плавак **мн**
ПЛАВНОСТЬ **ж** плаўнасць, -і **ж**
ПЛАНКА **ж** планка, -і **ж** (ворот) папярочка, -і **ж** О задеть
–"– -у зачапіць (крануць) планку
ПЛОВЕЦ **м** плывец, -ўца **м**
ПЛОВЧИХА **ж** плыўчыха, -і **ж**
ПЛОЩАДКА **ж** пляцоўка, -і **ж**
–"–, спортивная спартыўная пляцоўка
–"–, штрафная пляцоўка

ПЛОЩАДЬ **ж** плошча, -ы **ж** О затолкнуть соперника в –”– ворот заштурхнуць саперніка ў плошчу варот (брамкі)
ПОБЕДА **ж** перамога, -і **ж** О бороться за –”– -у змагацца за перамогу; добыть –”– -у здабыць перамогу; увенчаться –”– -ой закончыцца перамогай
–”–, бесспорная бясспрэчная перамога
–”– ввиду неспособности противника вести бой **бокс** перамога з-за немагчымасці праціўніка весці (працягваць) бой
–”– ввиду явного преимущества перамога з прычыны відавочнай перавагі
–”–, сенсационная сенсацыйная перамога
–”– с разгромным счётом перамога з разгромным лікам (рахункам)
–”–, уверенная упэўненая перамога
ПОБЕДИТЕЛЬ **м** пераможца, -ы **м** О выявить –”– устанавіць пераможцу; чествовать –”– -я ушаноўваць пераможцу
ПОБЕДИТЬ перамагчы
ПОБЕЖДЕННЫЙ пераможаны
ПОБИТЬ: побить рекорд пераўзысці рэкорд
ПО-БОКСЁРСКИ па-баксёрску
ПОВОРОТ **м** паварот, -у **м**
–”– в движении переступанием паварот у руху пераступаннем
–”– в стойке на руках паварот у стойцы на руках
ПОВРЕЖДЕНИЕ **ср** пашкоджанне, -ння **ср**; калецтва: -а **ср**
ПОВТОРЕНИЕ **ср** паўтор, -у **м**; паўтарэнне, -ння **ср**
–”– позиции, троекторное **шахм.** трохкратнае паўтарэнне пазіцыі
ПОДАЧА **ж** падача, -ы **ж**
–”–, крученная кручоная падача
–”–, неточная недакладная падача
ПОДВИЖНОСТЬ **ж** рухавасць, -і **ж**
ПОДВИЖНЫЙ рухавы
ПОДГОТОВКА **ж** падрыхтоўка, -і **ж**
–”–, атлетическая атлетычная падрыхтоўка
–”–, всесторонняя усебаковая падрыхтоўка
–”–, общая агульная падрыхтоўка

ПОДГОТОВКА скоростно-силовая хуткасна-сілавая падрыхтоўка
ПОДГРЕСТИ (вёслами) падвеславаць
ПОДДЕРЖКА **ж** падтрымка, -і **ж**
ПОДКАТ **м фут.** падкат, -у **м** О выполнить –"– выканаць (зрабіць) падкат
ПОДКРУТКА **ж** падкрутка, -і **ж**; падкручванне, -ння **ср**;
ПОДНОЖКА **ж**(подставка ноги под ногу) падножка, -і **ж**; 2. (ступенька) прыступка, -і **ж**
ПОДПРЫГИВАТЬ падскокваць
ПОДРАЖАНИЕ **ср** пераймание, -ння **ср**
ПОДРАЖАТЬ пераймаць
–"– игре знаменитого спортсмена пераймаць манеру гульні вядомага спартсмена
ПОДСЕД **м т. атл.** падсяданне, -ння **ср**; падсед, -у **м**
ПОДСЕДЛАННЫЙ засядланы
ПОДСЕДЛАТЬ засядлаць
–"– лошадь засядлаць каня
ПОДСЕЧКА **ж бор.** падсечка, -і **ж**; падсяканне, -ння **ср**
–"– под две ноги падсечка пад дзве (абедзве) нагі
ПОДСТРАХОВАТЬ падстрахаваць
ПОДСТРАХОВКА **ж** падстрахоўка, -і **ж**
ПОДСТУПНЫ **мн** надыходы -аў **мн** О перекрыть –"– -ы к воротам перакрыць падыходы да варот (брамкі)
ПОДТЯГИВАНИЕ **ср** падцягванне, -ння **ср**
–"– на перакладине падцягванне на папярочцы
–"– на турнике падцягванне на турніку
ПОДХОД **м** падыход, -у **м**; спроба, -ы **ж** (при многократном выполнении упражнения) –"– не засчитывается спроба не залічваецца
–"–, дополнительный **т. атл.** дадатковы падыход
–"– к препятствию падыход да перашкоды
–"– к гимнастическому снаряду падыход да гімнастычнага снарада
–"–, незасчитанный незалічаная спроба
ПОДЪЁМ **м** 1. (действие) падніманне, -ння **ср**; падняцце, -цця **ср**
–"– тяжестей падняцце (падніманне) цяжару
2. (дороги, местности) пад'ём, -у **м**; 3. (воодушевление) уздым, -у **м**; ; **4.** (часть ноги) усход, -у **м**; пад'ём, -у **м**

ПОДЪЁМ в упор силой падніманне ва ўпор сілаю
–"–, крутой круты (стромісты) пад'ём
–"– лесенкой лыжи узыходжанне (пад'ём) лесавічкай
–"– штанги на грудь без подседа падніманне (падняцце) ш штангі на грудзі без падсядання
ПОЕДИНОК м паядынак, -нку м; двубой, -ю м; дуэль, - і ж
–"– двух равных по силам соперников двубой роўных сілаю сапернікаў; паядынак (дуэль) двух роўных сілаю сапернікаў
–"–, упорнейший вельмі напружаны (упарты) паядынак (двубой, дуэль)
ПОЗИЦИЯ ж пазіцыя, -і ж; становішча, -а ср
–"–, благоприятная для броска пазіцыя (становішча) зручная для кідка
–"–, патовая шахм. патавае становішча (пазіцыя)
ПОИСКОВО-СПАСАТЕЛЬНЫЙ пошукава-выратавальны
ПОКРЫТИЕ ср пакрыццё, -я ср
–"–, асфальтовое асфальтавае пакрыццё
–"–, искусственное штучнае пакрыццё
ПОКОРЕНИЕ ср пакарэнне, -ння ср
–"– спортивной высоты пакарэнне спартыўнай вышыні
ПОКОРИТЬ (подчинить)пакарыць; (завоевать) заваяваць; (о спортивном снаряде) утаймаваць О –"– сердца болельщиков пакарыць (заваяваць) сэрцы заўзятараў
–"– штангу с рэкордным весом утаймаваць (пакарыць) штангу з рэкарднай вагой
ПОЛОЖЕНИЕ ср палажэнне, -ння ср; становішча, -а ср; пастава, -ы ж
–"– корпуса при метании копья становішча корпуса пры кіданні кап'я
–"– лежа при стрельбе из винтовки становішча лежачы пры стральбе з вінтоўкі
–"–, исходное зыходная пастава; першапачатковая пастава
–"– о соревнованиях палажэнне аб спаборніцтвах
ПОЛОСА ж паласа, -ы ж
–"– препятствий паласа перашкод
ПОЛУЗАЩИТА ж паўабарона, -ы ж
ПОЛУЗАЩИТНИК м паўабаронца, -ы м

ПОЛУЛЁГКИЙ паўлёгкі
ПОЛУЛЕГКОВЕС **м** паўлёгкавагавік, -а **м**
ПОЛУОБОРОТ **м** паўабарот, -а **м**
ПОЛУПРИСЕДАНИЕ **ср** паўпрысяданне, -ння **ср**
ПОЛУСРЕДНЕВЕС **м** (штангист среднего веса) паўсярэднева-гавік, -а **м**; штангіст паўсярэдняй вагавай катэгорыі
ПОЛУСРЕДНИЙ (игрок в футболе) паўсярэдні
ПОЛУТОРАМЕТРОВЫЙ паўтарамятровы
ПОЛУТЯЖЕЛОВЕС **м бокс** паўцяжкавагавік, -а **м**
ПОЛУФИНАЛ **м** паўфінал, -у **м**
ПОЛУФИНАЛИСТ **м** паўфіналіст, -а **м**
ПО МЕСТАМ! Па месцах!
ПОМОСТ **м** памост, -а **м**
ПОПАДАНИЕ **ср** пападанне, -ння **ср**; паражэнне, -ння **ср**
–"–, меткое трапнае пападание (паражэнне)
–"–, прямое непасрэднае пападанне (паражэнне)
ПОПАРНО парамі
ПОПАСТЬ (куда-л) трапіць; **(в кого, что) пацэліць;**
–"–.в финал соревнований трапіць у фінал спаборніцтваў
–"– в мишень пацэліць (трапіць) у мішэнь
ПОПЕРЁК упоперак
ПОПЕРЕМЕННО напераменку; папераменна
ПОПЫТКА **ж** спроба, -ы **ж** О засчитать –"– у залічыць спробу
–"– побить рекорд спроба пераўзысці рэкорд
–"–, зачетная заліковая спроба
ПОРАЖЕНИЕ **ср** пройгрыш, -у **м**; паражэнне, -ння **ср** О за-вершиться
–"– ем закончыцца пройгрышам (паражэннем); избежать –"–я пазбегчы паражэння (пройгрышу)
–"– ввиду неспособности продолжать бой **бокс** пройгрыш (паражэнне) з-за (па-прычыне) нlanguageздольнасці працягваць бой
–"– вследствие дисквалификации пройгрыш (паражэнне) з-за (па прычыне) дыскваліфікацыі
ПОРЫВ **м** імкненне, -ння **ср**; натхненне, -ння **ср**; см. подъём

ПОТРЯСАЮЩИЙ надзвычайны; надзвычай яркі; запамінальны; ашаламляльны
–"– штурм ворот ашаламляльны штурм варот (брамкі)
ПОХОДКА **ж** паходка, -і **ж**; хада, -ы **ж**
–"–, быстрая хуткая хада
–"–, спортивная спартыўная паходка (хада)
ПРЕВОСХОДСТВО **ср** перавага, -і **ж**
–"–, численное колькасная перавага
–"–, явное відавочная (яўная) перавага
ПРЕДОЛИМПИЙСКИЙ перадалімпійскі
ПРЕДПЛЕЧЬЕ **ср** перадплечча, -а **ср**
ПРЕДУПРЕЖДЕНИЕ **ср** папярэджанне, -ння **ср** О получить –"– атрымаць папярэджанне
–"– за опасное движение головой **бокс** папярэджанне за небяспечны рух галавой
–"– за пассивность папярэджанне за пасіўнасць
ПРЕИМУЩЕСТВО **ср** перавага, -і **ж** О закрепить –"– о замацаваць перавагу; утратить –"– о згубіць перавагу;
–"–, бесспорное бясспрэчная перавага
–"–, подавляющее велізарная перавага
ПРЕПЯТСТВИЕ **ср** перашкода, -ы **ж** О взять –"– е адолець перашкоду; установить –"– паставіць перашкоду;
ПРЕРЕКАНИЕ **ср** спрэчка, -і **ж** О вступить в –"– **я** с судьёй пачаць спрачацца з суддзёю
ПРЕССИНГ **м** прэсінг, -у **м**
–"–, зонный зонны прэсінг
–"– по всему полю прэсінг па ўсяму полю (усёй пляцоўцы)
ПРЕТЕНДЕНТ **м** прэтэндэнт, -а **м**
–"– на мировое первенство прэтэндэнт на першынство свету
ПРИЗЁР **м** прызёр, -а **м**
ПРИЗОВОЙ прызавы
ПРИКИДКА **ж** прыкідка, -і **ж** О провести –"– у перед главным стартом правесці (зрабіць) прыкідку перад галоўным стартам
ПРИМЕНЕНИЕ **ср** выкарыстанне, -ння **ср**; ужыванне, -ння **ср**
–"– допинга ужыванне допінгу

ПРИМЕНЕНИЕ стимуляторов выкарыстанне (ужыванне) стымулятараў

ПРИМЕР **м** прыклад, -у **м**; узор, -у **м**

